ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ '90

ЧАЦВЕР
30 ЖНІЎНЯ
№ 22(1651)

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

## 31 жніўня а 16-й гадзіне чакаем Вас на Дні ведаў!



3 ЖНІЎНЯ 1990 ГОДА САВЕТ МІНІСТРАЎ СССР ПРЫНЯЎ ПАСТАНОВУ "АБ УДЗЕЛЕ СТУДЭНТАЎ І НАВУЧЭНЦАЎ ВУЧЭБНЫХ УСТАНОЎ ВА ЎБОРЦЫ ЎРАДЖАЮ 1990 ГОДА". ВОСЬ ТАБЕ, СТУДЭНТ, І ЮР"ЕЎ ДЗЕНЬ З АДМЕНАЙ "ВЕРАСНЁЎСКАЙ БАРШЧЫНЫ" І ДОЎГАЧАКАНАЙ ВОЛЯЙ. "БУЛЬБА" НА ДОБРААХВОТНАЙ АСНОВЕ ПРАІСНАВАЛА ТОЛЬКІ ГОД. ЗРАЗУМЕЛА, НЕ АД ДОБРАГА ЖЫЦЦЯ...

АКТУАЛЬНА

## Пакуты па «бульбе»

Ствараючы ў мінулым «вясковым» семестры выязную рэдакцыю, мы прадбачліва папярэджвалі: пакуль студэнты побач з іншымі прыцягнутымі сіламі з'яўляюцца, па сутнасці, асноўнай вытворчай адзінкай, якая забяспечвае ўборку ўраджаю, «бульба» застанецца звычайнай справай яшчэ гадоў на дзесяць.

Для таго каб разгледзець у люстэрку сёлетняй не падлягаючай абскарджанню пастановы адбітак мінулагодніх дэмакратычных распараджэняў, неабавязкова быць аналітыкам — спрадвечная сістэма пастаўкі працоўных сіл была адным махам скасавана, новай не паспелі абмаляваць нават славесна. Вучэбныя ўстановы, глытнуўшы свежага паветра, звярнулі, нарэшце, увагу на ўласныя праблемы — прадпрыемствы, якія перайшлі на гаспадарчы разлік, ад спецыялістаў з сельскагаспадарчым ухілам адмаўляюцца. Хоць і першым, і другім зусім не да спадобы ні павышэнне цэн на прадукты харчавання (бульба, між іншым, на рынках рэспублікі ў параўнанні з мінулым годам стала даражэйшай на 14 капеек), ні модныя ў наш час візіткі. Здаецца, прырода ўзяла ў свае рукі справу сацыяльнай абароны слабай чалавечай істоты — забяспечыла яго багатым ураджаем.

ЯК САБРАЦЬ ГАТОВАЕ? Адкласці на час дэбаты і ратаваць сябе і дзяцей сваіх ад бессэнсоўнага галаду сярод райскіх шатаў. А студэнтам, такі ўжо лёс, рыхтавацца да «больш актыўнага ўдзелу ў правядзенні ўборачных работ». Пастановай прадугледжана перанясенне пачатку вучэбнага года на больш позні тэрмін (не звыш аднаго месяца).

Знарок ці выпадкова, толькі чамусьці, падпісваючы «некралогі» прагрэсіўнаму і набалеламу мінулагодняму «бульбяному» загаду, многія нашы калегі не акцэнтавалі ўвагі на апошнім з тых, што датычаць студэнтаў, пункце пастановы. Мы ж, пабываўшы на нарадзе дэканаў, загадчыкаў кафедраў, прадстаўнікоў грамадскіх арганізацый і прымаючых гаспадарак, лічым не лішнім заручыцца гарантыяй, што будуць арганізаваны «належнае грамадскае харчаванне, культурна-бытавое і медыцынскае абслугоўванне, створаны ўмовы для высокапрадукцыйнай працы і матэрыяльнай зацікаўленасці ў яе выніках».

І яшчэ раз пераконваемся, што пагроза гібелі бульбы — не надзвычайнае становішча, а прывычнае для нашай краіны існаванне. Настолькі прывычнае, што кіраўнікі падшэфных гаспадарак пра неабходную, здаецца, больш за ўсё для іх нараду ва універсітэце забыліся. Ды й пра што гэта мы? Пра бязлікія працоўныя адзінкі? Ёсць у іх, у гаспадарнікаў, час на такія дробязі! Што ж, вытрымаем: нам не прывыкаць. Але калі «бульба» санкцыяніравана на такім высокім уроўні — можна разлічваць і на належную ступень кантролю за выкананнем урадавай пастановы. Ды й рэктарат, прыклаўшы ўсе намаганні да арганізацыі дзелавой сустрэчы, мае права пры адсутнасці папярэдняга заключэння дагавораў у выдзяленні працоўнай сілы адмовіць.

**ДА ВЕДАМА СТУДЭНТАЎ.** На нарадзе прынята рашэнне аб накіраванні на сельгасработы другакурснікаў у Шклоўскі, Круглянскі і Асіповіцкі раёны (дарэчы: Віктар Анатольевіч Дзмітрыеў, адказны работнік Магілёўскага абласнога аграпрома, запэўніў, што «ўсе прымаючыя гаспадаркі маюць абсалютна «чысты» радыяцыйны фон», а мы, выязная рэдакцыя «БУ», давяраем, але і праверым), першакурснікаў у Мядзельскі, Вілейскі, Маладзечанскі, Стаўбцоўскі, Пухавіцкі, Смалявіцкі, Клецкі, Валожынскі раёны Мінскай вобласці.

Выезд сельгасатрадаў плануецца да 5 верасня.

АБІТУРЫЕНТ-90

## ХТО НА НОВЕНЬКАГА?

У адпаведнасці з Правіламі прыёму і Інструктыўнымі пісьмамі камітэта Дзяржадукацыі СССР і Мінадукацыі БССР загадам па універсітэту № 655-К ад 29 снежня 1989 года была створана прыёмная камісія пад старшынствам рэктара.

Адказным сакратаром прыёмнай камісіі быў прызначаны дэкан геаграфічнага факультэта прафесар Р. А. Жмойдзяк.

У выніку праведзенай прыёмнай камісіяй падрыхтоўчай работы універсітэт змог забяспечыць дастаткова высокі конкурс паступаючых пры якаснай падрыхтоўцы выпускнікоў сярэдніх школ.

На 1925 месц было пададзена (без уліку падрыхтоўчага аддзялення) 4347 заяў. Самым «залатым» аказаўся факультэт правазнаўства, куды паступала 317 з 1596 медалістаў.

126 пераможцаў міжнародных, усесаюзных, рэспубліканскіх (БССР), абласных і г. Мінска алімпіяд абралі месцам вучобы універсітэт.

Конкурс у сярэднім па універсітэту склаў 2,5 чалавека на месца. Самы высокі — на вытворчым аддзяленні біялагічнага факультэта — 6,6 чалавека на месца. Самы нізкі — на педагагічным аддзяленні фізічнага факультэта — 1 чалавек на месца.

З ліку паступаючых дзённую школу скончылі 4013 абітурыентаў, тэхнікумы — 198, СПТВ — 155.

За права быць студэнтамі змагаліся 1688 юнакоў і 2659 дзяўчат; 1852 мінчаніны, 844 жыхары Мінскай вобласці, 232 — Брэсцкай, 273 — Віцебскай, 190 — Гомельскай, 253 — Гродзенскай, 301 — Магілёўскай.

На завочнае навучанне на 700 месц было пададзена 1555 заяў, у тым ліку ад 152 медалістаў.

На вячэрняе навучанне на 175 месц было пададзена 198 заяў (25 — ад медалістаў).

Уступныя экзамены здавалі 4297 абітурыентаў (125 не з'явіліся на першы экзамен). Усе выпрабаванні вытрымалі 2865 абітурыентаў. 850 з іх з першых дзён заявілі сябе прэтэндэнтамі на «чырвоны» дыплом, здаўшы ўступныя экзамены на «выдатна». 138 пакарыліся долі «ціхіх троечнікаў».

Пацярпелі фіяска, атрымаўшы нездавальняючыя адзнакі, 1100 абітурыентаў. «Прызёры» тут абітурыенты, што паступалі на спецыяльнасць «філасофія» (48 працэнтаў ад тых, што паступілі).

Найбольш высокі прахадны бал на дзённым навучанні быў па спецыяльнасці руская мова і літаратура — 15, самы нізкі на педагагічным аддзяленні фізічнага факультэта — 6.

САКРЭТ ФІРМЫ

## РЭКАМЕНДУЕ... ПАСТАР

А што вы скажаце на тое, што звычайныя дакументы — атэстаты і медыцынскія даведкі — прыёмнай камісіяй Латвійскага універсітэта часам не прымаліся без прыкладзенай да іх рэкамендацыі пастара прыхода? Дажыліся?!

З 1 верасня галоўная ВНУ рэспублікі пачынае рыхтаваць тэолагаў. Ды й рэкамендацыя — не канец выпрабаванням. Акрамя замежнай мовы і сачынення на рэлігійную тэму, абітурыенты зведваюць праверку музычных даных і рэлігійных ведаў.

У ВАС ЁСЦЬ ШАНЦ

## Вучыся, сыне!

Спецыялісты статыстычнага цэнта Фінляндыі і вучоныя універсітэта г. Хельсінкі даследавалі залежнасць узроўню смяротнасці ад узроўню адукацыі ў сваёй краіне. Былі прааналізаваны даныя за пятнаццаць год — з 1970 да 1985 года. За гэты час у Фінляндыі смяротнасць сярод асоб з вышэйшай адукацыяй скарацілася на 27 працэнтаў, а сярод рабочых — толькі на 13 працэнтаў. Апошнія часцей за ўсё пamipалі ад алкагольнага атручвання, рака лёгкіх, няшчасных выпадкаў, канчалі жыццё самагубствам. Сярод асоб з вышэйшай адукацыяй найбольш распаўсюджанай прычынай смерці з'яўляюцца захворванні органаў кровазвароту.

«Для нас стала адкрыццём,— сказаў на прэс-канферэнцыі, прысвечанай абнародаванню вынікаў даследаванняў, кіраўнік групы прафесар Тапані-Валконен,— што адрозненні ў адукацыі выяўляюцца і ў старасці. Так, смяротнасць сярод пенсіянераў, якія былі рабочымі, сялянамі і малодшымі ІТР і ў старасці на 20 працэнтаў вышэй, чым сярод высокаадукаваных людзей».

# «Паспрабуйце на наступны год»,
## або Чаму простаму смяротнаму абітурыенту ўсё цяжэй паступіць у ВНУ



«Цішэй, ідуць экзамены!» — перасцерагае нас шыльдачка. І ўсё ж давайце паспрабуем заглянуць у адну з аўдыторый...

Дацэнты С. К. Жарко і М. Ф. Чудаеў прымаюць уступны экзамен па гісторыі. Дарэчы, ён рашаючы ў тых, хто выбраў для паступлення рускамоўнае аддзяленне гістарычнага факультэта. Да стала адзін за другім нясмела прыладкоўваюцца абітурыенты. Боязь і непераадольнае хваляванне зрабілі іх галасы амаль аднолькавымі — ціхімі і ледзь чутнымі, а адказы — падобнымі адзін на другі. Праслухаўшы многія з іх, міжволі згаджаюся са старшынёй прадметнай камісіі па гісторыі, дацэнтам кафедры гісторыі СССР дасавецкага перыяду А. А. ЯНОЎСКІМ, які на пытанне аб сярэднім узроўні падрыхтоўкі абітурыентаў адказаў:

— Вельмі нізкі. Я б сказаў, шэры, з маленькімі праблiскамі святла.

У чым жа прычыны? Іх некалькі. У першую чаргу, думаю, зрабіла сваю справу адмена ў школах экзамена па гісторыі. У гэтым годзе, праўда, паспрабавалі выправіць памылку, даўшы магчымасць выпускнікам самімі вырашаць, якія здаваць экзамены. Але ў абавязковы пералік гісторыя не трапіла, а пайсці на гэты крок самастойна адважыліся нямногія — вельмі ўжо вялікі аб'ём матэрыялу. Вось і атрымалася, што нават тыя, хто думаў паступаць на гуманітарныя факультэты, здавалі што давядзецца, толькі не гісторыю. А за два-тры тыдні, што былі ў распараджэнні абітурыентаў, адолець курс, які ахоплівае ўвесь перыяд гісторыі нашай краіны, згадзіцеся, не так ужо проста. (І гэта яшчэ адна прычына дрэнных адказаў.)

— Прычым, толькі прачытаць падручнік і запомніць усе даты недастаткова,— заўважае А. А. Яноўскі.— Абітурыент павінен арыентавацца ў сучаснай ацэнцы гістарычных падзей, хаця б у цэлым ведаць гіпотэзы, якія прапануюць тыя ці іншыя вучоныя. На жаль, дабіцца таго, каб паступаючы выказаў свой пункт гледжання на тую ці іншую праблему, удавалася нячаста.

Напрыклад, выцягнуў абітурыент білет, а адно з пытанняў у ім — калектывізацыя. І пайшоў спяваць дыфірамбы. Не прыдзярэшся — усё па падручніку, выдадзенаму ў лепшым выпадку ў... канцы 70-х — пачатку 80-х гадоў. Спытаеш, які асноўны прынцып калектывізацыі быў парушаны — маўчанне. Высокія патрабаванні прад'яўляем? Дык жа да тых, хто марыць стаць гісторыкам і проста абавязаны арыентавацца ў падзеях мінулых і сённяшніх, мець свой пункт гледжання на той ці іншы факт і ўмець яго выказаць. Для гэтага патрэбна не так ужо і многа — сачыць за перыядычнымі выданнямі. Вось тады не будзе просьбаў накшталт: «Задайце, калі ласка, яшчэ якія-небудзь пытанні, я рыхтавалася». Ідзеш на ўступкі, але і гэта дапамагае рэдка.

Магчыма, варта сказаць, што і сама сітуацыя, якая склалася на некаторых факультэтах універсітэта, наўрад ці спрыяла гэтаму. Яшчэ не паспеўшы падаць заяву, абітурыент даведваецца: на не надта ўжо вялікую колькасць месц яшчэ да ўступных экзаменаў залічана энная колькасць чалавек. Потым незнарок чуеш, што нават здаўшы экзамены паспяхова, ты станеш студэнтам у апошнюю чаргу — ёсць вялікі спіс тых, хто мае права на льготы і для каго гэтага вар'яцкага конкурсу не існуе. Гэта так званыя «мэтавікі», воіны-афганцы, стажнікі, дзеці-сіроты, жыхары забруджаных раёнаў...

Не, зразумейце мяне правільна: я не супраць міласэрнасці, але катэгарычна пратэстую супраць розных паблажак. Надта многа іх было ў мінулым. І да чаго мы прыйшлі? Да таго, што звялі да мінімуму інтэлектуальны патэнцыял краіны. Спачатку аддавалі перавагу сельскім абітурыентам. Зараз такая магчымасць прадстаўлена: калі ў цябе мэтавае накіраванне — здавай на тройкі і дарога ва універсітэт адкрыта. А тыя, у каго ў экзаменацыйных лістах «выдатна» і «добра» — паспрабуйце на наступны год, магчыма вам пашанцуе. Але пасля ўсіх пакут адважваюцца на такі крок нямногія. Дзе ж, дазвольце задаць пытанне, роўнае права на атрыманне вышэйшай адукацыі? Вось тут, лічу, калі мы клапоцімся аб будучым нацыі, павінна ісці справядлівая барацьба, без усялякіх скідак і прывілей. Ад гэтага залежыць, якія ў нас будуць заўтра настаўнікі, інжынеры, юрысты, медыкі.

Магчыма, варта выкарыстаць замежны вопыт, дзе ў ВНУ прымаюць усіх жадаючых без усялякіх экзаменаў і гутарак. Ужо пасля першага семестра яны пакрыху адсейваюцца: каго выключаюць за непаспяховасць, хто сам бачыць, што не па Сеньку шапка, і пакідае вучобу: ці варта дарма траціць грошы?

Вышэйшай адукацыі даўно патрэбны перамены. Ужо сёння, у горшым выпадку — заўтра. Час адкрыць дарогу разумным, талковым маладым людзям. Гэта ў першую чаргу. Але пакуль, на жаль, не заўсёды так атрымліваецца.

Такія вось не зусім радасныя ўражанні вынесла я пасля наведвання ўступных экзаменаў у нашым універсітэце.

З. АЛЯШКЕВІЧ.

Фота М. АХРАМЕНКІ.



# Крытэрый—міласэрнасць?

**Якімі льготамі карыстаюцца абітурыенты з Магілёўскай вобласці?**

**М. ЮРЧЫК.**

Як нам паведамілі ў прыёмнай камісіі, ільготы сапраўды існуюць. Яны распаўсюджваюцца на тых выпускнікоў школ, якія жывуць у дванаццаці раёнах Магілёўскай вобласці: Краснапольскім, Слаўгарадскім, Касцюковіцкім, Клімавіцкім, Чэрыкаўскім, Быхаўскім, Магілёўскім, Крычаўскім, Чаускім, Бялыніцкім, Клічаўскім, Кіраўскім. У адпаведнасці з пісьмом міністра народнай адукацыі БССР М. І. Дзямчука ад 28 чэрвеня гэтага года сёлета льготы абітурыентам з зоны жорсткага санітарнага кантролю пры паступленні ў сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы рэспублікі пашыраны.

На заклік Магілёўскага абласнога Савета народных дэпутатаў уважліва аднесціся да абітурыентаў, якія пражываюць на забруджанай у выніку аварыі на Чарнобыльскай АЭС тэрыторыі, амаль усе міністэрствы адрэагавалі аднолькава: мы — «за». Вырашылі: каб выпускнік, які прыехаў з «зоны», стаў студэнтам-першакурснікам, дастаткова мець накіраванне адпаведных мясцовых арганізацый і прадпрыемстваў. Прычым, некаторыя ВНУ не вызначаюць ніякага колькаснага абмежавання (для даведкі: Інстытут фізічнай культуры і спорту гатовы быў прыняць сёлета 14 чалавек, Інстытут культуры — 24).

Праўда, знайшліся і цвярозыя галовы. Міністэрства аховы здароўя вырашыла: лічым, што ў сённяшніх умовах немэтазгодна прымаць абітурыентаў з пералічаных раёнаў без уступных экзаменаў, таму што гэта прывядзе да значнага зніжэння якаснага ўзроўню паступаючых і ў будучым — да выпуску некваліфікаваных спецыялістаў.

Прыёмная камісія нашага універсітэта паспрабавала знайсці кампраміс: паступіць міласэрна і ў той жа час не забываць аб тым, якіх мы падрыхтуем маладых спецыялістаў. Усе абітурыенты, што прыехалі з забруджанай зоны і мелі ў атэстаце выдатныя і добрыя адзнакі, у абавязковым парадку праходзілі субяседаванне (і медалісты таксама, якія згодна з загадам міністра павінны былі залічвацца адразу). Па яго выніках і вялося залічэнне на першы курс.

# Блат «знізу»?

**Чула, быццам сёлета ў вышэйшых навучальных установах рэспублікі праводзіцца эксперымент. Сутнасць яго ў тым, што на ўступных экзаменах залічваецца адзнака, выстаўленая абітурыенту на выпускных экзаменах у школе настаўнікамі-метадыстамі і педагогамі-наватарамі. Ці не будзе гэта блатам «знізу»?**

**Т. ЕМЯЛЬЯНАВА,**
**абітурыентка.**

Каб даць кампетэнтны адказ на пастаўленае пытанне, мы вырашылі звярнуцца да адказнага сакратара прыёмнай камісіі Р. А. ЖМОЙДЗЯКА.

— Сапраўды, быў загад міністра № 124 ад 14 мая 1990 года «Аб правядзенні эксперымента ў вышэйшых навучальных установах Міністэрства народнай адукацыі БССР: прыняцце ў якасці адзнакі на ўступных экзаменах адзнак, выстаўленых раней абітурыентам настаўнікамі-прадметнікамі на выпускных экзаменах у школе». У сувязі з гэтым ужо другім загадам — начальніка ўпраўлення народнай адукацыі Мінскага аблвыканкома былі зацверджаны настаўнікі-метадысты, якія ўдзельнічалі ў эксперыменце.

Атрымліваецца, што абітурыенты — навучэнцы настаўнікаў-метадыстаў і педагогаў-наватараў — аказваюцца па-за канкурэнцыяй — яны ў больш выгадным становішчы, чым медалісты, бо апошнім трэба здаваць экзамен па прафілюючаму прадмету. Мы не згодны з такой пастаноўкай пытання і выказалі свой пункт гледжання ў міністэрстве. З яго згоды ўнеслі невялікія карэктывы ў эксперымент: абітурыенты, якія вучыліся ў настаўнікаў-метадыстаў і педагогаў-наватараў, павінны былі прайсці субяседаванне. Калі яны пацвярджалі адзнаку, выстаўленую ў школе, яна і залічвалася ў якасці адзнакі на ўступным экзамене. У адваротным выпадку камісія рэкамендавала яго дапусціць да здачы ўступных экзаменаў па дадзенаму прадмету ў адпаведнасці з Правіламі прыёму.

На нашу думку, такое новаўвядзенне было б апраўдана ў тым выпадку, калі б колькасць паступаючых не перавышала колькасці планавых месц. Пакуль жа ўсё наадварот. Калі ўлічыць, што па Мінскай вобласці такіх настаўнікаў-метадыстаў і педагогаў-наватараў каля сотні, а ў Мінску — больш трыццаці, то не надта радасная перспектыва вымалёўваецца для простага смяротнага абітурыента (дадайце сюды яшчэ медалістаў). Наша ж задача — даць аднолькавую магчымасць паспрабаваць свае сілы і атрымаць вышэйшую адукацыю кожнаму выпускніку.

Падрыхтавала
З. АЛЯКСАНДРАВА.

БЕЗ ВІЗЫ

# Ведамі ўзбройваюцца дзяды

**Звычайна ў такім узросце бавяць час за партыяй у шашкі ці вязаннем моднага швэдра для ўнучкі. Аднак «грамадская традыцыя» не ў стане забараніць «дзівакам»-пенсіянерам вывучаць гісторыю мастацтваў, французскую мову або набываць навыкі журналісцкага майстэрства. Тым больш, калі існуе ва універсітэце Калгары праграма вольнага наведвання для тых, каму за шэсцьдзесят.**

**Састарэлыя «вучні» (як, дарэчы, і ўсе астатнія) выбіраюць дысцыпліны на свой густ з агульнага спісу навук. Розніца паміж дваццацігадовай Катрын Янг і шасцідзесяцігадовай Гейл Пейс у тым, што апошняя атрымлівае адукацыю бясплатна, для прыёму яе ў групу дастаткова згоды выкладчыка.**

**Пры агульным недахопе вучэбных аўдыторый і нешматлікім выкладчыцкім штаце універсітэт не мае ніякай карысці ад арганізацыі праграмы для студэнтаў пенсіённага ўзросту, затое ў тых, хто адважваецца ў старасці вярнуцца да падручнікаў, шмат пераваг. Яны не абавязаны выконваць патрабаванні, якія не адпавядаюць іх уласным інтарэсам,— залікі і экзамены можна пакінуць у спадчыну маладзейшым.**

**Часам сябры не разумеюць іх. А што тут дзіўнага, калі сямідзесяцігадовы ўрач Цім Глова ўсё жыццё цікавіўся гісторыяй і, нарэшце, дзякуючы праграме універсітэта Калгары атрымаў магчымасць вывучаць прадмет сістэмна, а шасцідзесяцігадовая настаўніца Валеры Кэн разблытвае ўласныя фінансавыя праблемы з дапамогай выкладчыкаў бізнес-факультэта?**

**Жыць — значыць авалодваць новымі ведамі. Таму каталог прадметаў універсітэта Калгары ў руках Гейл Пейс — з'ява амаль сімвалічная.**

З. МАРАВА.
Калгары — Мінск.

РЭПЛІКА

# НАШЧАДКІ БЭНДЭРА

Хто самы знаходлівы чалавек на свеце? «Безумоўна, Астап Бэндэр»,— не задумваючыся адкажаце вы.

Але ўсе рэкорды маюць адну ўласцівасць: з часам яны перастаюць быць рэкордамі. Пацярпела крах і дасягненне Бэндэра. Знайшліся іншыя людзі, больш кемлівыя і руплівыя. Хто яны? Заканатворцы з Міністэрства народнай адукацыі. Яны вынайшлі столькі спосабаў ускладніць жыццё абітурыентаў ужо з першага дня знаёмства з прыёмнай камісіяй, што папулярнаму герою рамана іх ніколі не абскакаць.

Пачынаецца ўсё з падачы заявы. Вам даюць запаўняць анкету, у якой каля дваццаці пунктаў і ўсе адказы патрэбна пісаць разборліва, друкаванымі літарамі. Запоўнілі ў грамадскай прыёмнай, панеслі разам з дакументамі ў камісію. Там паглядзелі... і вярнулі назад: «Для паступлення на педагагічныя спецыяльнасці патрэбна рэкамендацыя савета школы ці працоўнага калектыву, ці райкома камсамола». Гэтага патрабуюць Правілы прыёму. (А, кажуць, у краіне «напражона» з паперай.) Паціскаюць плячыма абітурыенты і іх бацькі: навошта гэта фармальнасць? Усе ж ведаюць, што ніякі савет у школе дзеля гэтага не засядае і ніякага рашэння не прымае. Ды, урэшце, дзе ж зноў-такі аднолькавае права на атрыманне адукацыі? Выходзіць, караць ці міласаваць вырашае савет школы.

Паспрабуйце знайсці рацыю і ў наступным патрабаванні. Пры паступленні ад вас патрабуюць медыцынскую даведку, якую выдае паліклініка па месцы жыхарства абітурыента. Але сёння мы прывыклі браць усё пад сумненне. Таму і пасадзілі ў асобным пакоі асобнага чалавека, каб правяраў адпаведнасць здароўя паступаючага даведцы. Відаць, вельмі высокай кваліфікацыі сядзіць спецыяліст, калі з першага погляду вызначыць, нармальны вы чалавек ці з нейкімі адхіленнямі.

Можна было б яшчэ весці размову аб супярэчнасцях і недасканаласці сістэмы прыёму дакументаў і ўступных экзаменаў, але хопіць. Дайце хоць малюсенькі шанц Астапу Бэндэру ўтрымаць рэпутацыю самага знаходлівага.

З. МІХНЕВІЧ.

## «Зачыні за мной дзверы...»







Віктар ЦОЙ загінуў маладым. Але за сваё кароткае жыццё ён паспеў зрабіць шмат. Яго любілі мільёны. І не толькі моладзь. У яго песнях шукалі і знаходзілі адказы на пытанні, што задавала жыццё. Думаецца, яшчэ прыйдзе час, калі мы асэнсуем страту па-сапраўднаму.

БАГАСЛОЎСКІЯ МОГІЛКІ Ў ЛЕНІНГРАДЗЕ. Раней хадзілі «на Цоя» ў канкрутныя залы, цяпер будуць хадзіць сюды, да яго магілы. Тысячы людзей пабывалі тут у дзень пахавання, памяць аб ім застанецца ў кожным. Віктара няма, але гучаць песні, што спяваў ён. Таварышы дапрацуюць апошні альбом, які паспелі запісаць да смерці Цоя, і групы «Кіно» больш не будзе.

«Зачыні за мной дзверы...»

С. ГРЫЦ.

Фота аўтара.










## НАДЗВЫЧАЙНАЕ ПАЛАЖЭННЕ

У самым пачатку жніўня яны скінулі з сябе ваенную форму. Напісалі заявы («па прычыне майго нежадання праходзіць ваенныя зборы...», «па сямейных абставінах...») і — толькі іх спіны і бачылі...

Вы ўжо маглі прачытаць у рэспубліканскіх газетах аб інцыдэнце з удзелам студэнтаў гуманітарных факультэтаў БДУ, што адбыўся на ваенных зборах ва Уруччы. 39 з іх — прыкладна трэцяя частка — у першыя дні збораў пакінулі іх.

Пэўна, кожны з чытачоў вырашыў для сябе, якія словы больш падыходзяць у такой сітуацыі: надзвычайнае здарэнне, сабатаж, дэзерцірства... А нехта, магчыма, палічыў яго наогул не вартым увагі: маўляў, каго сёння, сярод навалы ў жыцці самых вострых сюжэтаў, можа здзівіць падобная дробязь. Тым больш, што існуе ўжо афіцыйны дазвол не наведваць заняткі на ваеннай кафедры тым студэнтам, якія адбылі тэрміновую службу ў арміі.

Яны, тыя трыццаць дзевяць, у арміі адслужылі. І ваенную кафедру прайшлі — 450 вучэбных гадзін. Заставалася мала: месяц збораў — і ты афіцэр запасу, камандзір узвода мотастралкоў. Не захацелі? Не здолелі?

Слова аднаму з удзельнікаў падзей, з якім давялося пагаварыць. Ён пажадаў выражаць свае думкі для газеты ананімна:

— Я быў настроены на зборы з самага пачатку, нават з жаданнем ехаў на іх: месяц на прыродзе — зусім нядрэнна. Але тое, што чакала нас на месцы... Такіх свінскіх умоў за два гады ў арміі я не бачыў.

Спачатку ад удзелу ў зборах вырашылі адмовіцца ўсе. Але пасля размовы з камандаваннем часці і прадстаўнікамі рэктарата такіх аказалася 25, яшчэ 14 вярнуліся дадому на другі дзень. Самыя крыкуны засталіся...

Асабіста я далучыўся да «пратэстантаў» таму, што лічыў неабходным стрымаць сваё слова. Думаю, што першыя 25 чалавек — гэта тыя, хто ўмее рабіць выбар паміж «так» і «не». Наш учынак — не пратэст супраць выкладчыкаў ваеннай кафедры, да іх мы прэтэнзій не маем. Мы змагаліся за чалавечыя ўмовы для сябе. Ні ў якім разе гэта і не адмова служыць у Савецкай Арміі, і не хацелася б, каб палітычнае становішча ў нашай краіне змянілася настолькі, што нашы дзеянні расцанілі б як здрадніцтва. Сабатажам яны таксама не былі: мы б наогул не выязджалі на зборы, каб збіраліся іх ігнараваць...

У загадчыка ваеннай кафедры падпалкоўніка Ю. І. БАЛЬШАКОВА меркаванні з гэтай нагоды іншыя. Ён падазрае, што некалькі студэнтаў падрыхтавалі заявы яшчэ дома, да выезду на палігон. Яны, на думку Юрыя Ільіча, і сталі асноўнымі зачыншчыкамі падзей. Ён лічыць, што гэта здарэнне выглядае надзвычайным з маральнага боку: выходзіць, кафедра не дапрацавала ў пытаннях выхавання студэнтаў...

Падпалкоўнік Бальшакоў упэўнены, што 39 чалавек, якія не засталіся на зборах, толькі нашкодзілі самі сабе: пасля заканчэння універсітэта ім усё роўна давядзецца выехаць на зборы, толькі ўжо на трохмесячныя. А хто не трапіць на іх, не стане афіцэрам — таксама сутыкнецца потым з праблемамі. Напрыклад, калі-небудзь апынецца на зборах у складзе свайго прадпрыемства ці ўстановы, дзе будзе працаваць кіраўніком падраздзялення. І яго падначалены на службе будзе яго камандзірам у справах ваенных.

Дарэчы, наш ананімны субяседнік лічыць трохмесячныя зборы зусім не абавязковымі, і ў гэтым сэнсе спакойны...

...Тыя, хто засталіся тады на зборах, у палатках у полі не жылі. Камандаванне ваеннай часці, дзе яны былі размеркаваны, у адказ на пратэст студэнтаў прадаставіла ім на ўвесь тэрмін збораў казарму. Гавораць, лепшую ў ваеннай акрузе. У сталоўцы паміж сталамі растуць пальмы і іншыя паўднёвыя дрэвы — цытрусавыя плады літаральна валяцца ў талеркі ў час снедання ці абеду...

А хто ж жыў у той узорнай казарме і харчаваўся ў той казачнай сталоўцы раней? Мабыць, салдаты, якім «не хапіла характару», каб не згадзіцца выехаць з казармы ў поле, вызваліўшы месца для студэнтаў. А можа мы проста не ведаем аб іх пратэсце...

Сярод нашых студэнтаў ён за час збораў не паўтараўся. Усё добра, усё ў парадку?

Ю. І. Бальшакоў паведаміў, што з гэтага вучэбнага года заняткі на ваеннай кафедры будуць праводзіцца толькі для тых, хто падасць заяву аб жаданні ў іх удзельнічаць. Ён нават дапускае магчымасць выбару лепшых студэнтаў сярод жадаючых — у выпадку, калі вучэбных месц на кафедры будзе не хапаць. Студэнты ж зараз на тэрміновую ваенную службу не прызываюцца.

А яны тым часам аспрэчваюць саму неабходнасць існавання ваенных кафедраў у ВНУ. Аргументы Юрыя Ільіча аб дзешавізне такой падрыхтоўкі афіцэраў у параўнанні з затратамі на вучобу ў ваенных вучылішчах — не факты для юнакоў. Рэальны факт для іх — скарачэнне арміі. Для падпалкоўніка Бальшакова — недахоп у ёй афіцэраў.

А самай-самай аб'ектыўнай рэальнасцю для ўсіх застаецца існаванне такіх праблем, патрэба іх абмяркоўваць, неабходнасць насіць зброю і ваенную форму. Не існаваць бы гэтай форме наогул. Ва ўсім свеце...

В. БЯГУН.

СКАРБОНКА

КАРЫСНЫХ ПАРАД

## ЛЕПШЫ ПАДАРУНАК — СШЫТАК



Вас, напэўна, прывучылі ўжо назапашваць любыя тавары загадзя, агульныя сшыткі ў тым ліку. Без іх студэнцкае існаванне немагчыма — паведамляем для першакурснікаў.

І ўсім раім пакуль не баяцца «сшытачнага дэфіцыту». *СШЫТКІ Ў КРАМАХ ЁСЦЬ.* Праўда, набыць без школьных талонаў можна толькі агульныя. Спатрэбяцца тонкія — наладжвайце кантакты з вучнямі сярэдніх школ, калі маеце надзею, што яны выдзеляць для вас колькі-небудзь адзінак з тых трыццаці сшыткаў, якія прадаюцца ім на талон.

Акрамя тонкіх сшыткаў, тое-сёе можна купіць і без талонаў. Толькі з пустымі рукамі ў краму ўсё роўна не варта хадзіць — пашпарт спатрэбіцца абавязкова, той, што са штампам аб прапісцы ў Беларусі. Але мы ўжо звыкліся з яго дыктатам. Ці не?..

*АКРАМЯ МАГАЗІНА «ШКОЛЬНІК» ПА ВУЛІЦЫ СВЯРДЛОВА, 3, СШЫТКІ МОЖНА НАБЫЦЬ У СПЕЦЫЯЛІЗАВАНЫХ МАГАЗІНАХ «КАНЦТАВАРЫ» ПА ПРАСПЕКЦЕ ПУШКІНА, 77 І ПРАСПЕКЦЕ РАКАСОЎСКАГА, 114, А ТАКСАМА Ў АДПАВЕДНЫХ СЕКЦЫЯХ УНІВЕРМАГАЎ І — ЧАСАМ — У КІЁСКАХ «САЮЗДРУКУ». НА ПОШУКІ! НАМ НЕ ПРЫВЫКАЦЬ!*

УЯВІЦЕ САБЕ!

## ВАЛЮТА ІДЗЕ Ў РУКІ

10 тысяч долараў! Прыкладна такую суму прынесла універсітэту навучанне ў мінулым годзе на падрыхтоўчым факультэце для замежных грамадзян сямі студэнтаў з Кувейта. Спроба была першай для БДУ. І ўдалай: «валютныя» навучэнцы, акрамя аднаго, паспяхова закончылі падрыхтоўчы курс. Трое з іх сталі студэнтамі Мінскага медыцынскага інстытута, астатнія будуць працягваць навучанне ў Маскве.

У гэтым годзе плануецца прыезд да нас на вучобу каля 40—50 грамадзян Кувейта — на той жа, грашовай, аснове. Падрыхтоўчы факультэт чакае іх. Але ваенныя падзеі ў раёне Персідскага заліва пакуль не даюць ім магчымасці крануцца далей за аэрапорт.

Заробленыя долары выкладчыкі і супрацоўнікі факультэта на ўласныя вочы не бачылі. Але хутка яны разам са студэнтамі атрымаюць магчымасць карыстацца ксераксам, набытым на частку тых грошай.

*23 КАСТРЫЧНІКА адбудзецца XXIV з'езд ЛКСМ Беларусі. Камсамольскую арганізацыю універсітэта на ім будуць прадстаўляць 4 дэлегаты. Выбары адбудуцца 24 верасня а 18-й гадзіне на пашыраным пасяджэнні камітэта камсамола універсітэта. Права вылучаць дэлегатаў маюць: камсамольскія арганізацыі груп, кафедраў, факультэтаў. Магчыма і самавылучэнне.*

*Матэрыялы аб вылучэнні кандыдатаў у дэлегаты (пратаколы сходаў) падаваць у камітэт камсамола універсітэта да 24 верасня гэтага года.*

*За вамі — ваш выбар!*

*КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.*

НА ЎСЯЛЯКІ ВЫПАДАК

## ПАМЫЛКА ЦІРОНА

Стэнаграфію прыдумаў вялікі Ціран, раб славутага Цыцэрона.

У той час узровень ведаў пра мову быў недастаткова высокі, і Ціран дапусціў некаторыя недакладнасці. Ён вырашыў, што стэнаграфічныя знакі павінны быць падобнымі на адпаведныя гукі звычайнага пісьма. У такім разе, разважаў Ціран, вывучаць стэнаграфічны алфавіт будзе лягчэй.

Аднак вывучаюць знакі толькі адзін раз, але калі ў цэлым алфавіт акажацца няўдалым, то пакутуюць з ім... ужо дзве тысячы гадоў.

Памылка Цірона пераходзіла з адной сістэмы ў другую і так дажыла да нашых дзён. З'явіліся і іншыя.

За прайшоўшыя тысячагоддзі мовазнаўства ўзбагацілася новымі адкрыццямі, але, на жаль, яны не былі на карысць стэнаграфіі. У складаным слове «стэнаграфія» другая частка «графо» — гэта значыць «пішу». Тым не менш паслядоўнікі Цірона замест графікі аддавалі перавагу... фанетыцы: гукам, блізкім фанетычна, давалі падобныя напісанні. Такая ўмоўнасць зноў прыводзіла да нязручных спалучэнняў і ўскладняла тэорыю.

А патрэбна было ўсяго толькі раз і назаўсёды адмовіцца і ад сляпога пераймання літар звычайнага пісьма, і ад фанетычнага прынцыпу пабудовы стэнаграфічнага алфавіту, і ад іншых няпэўных тэорый.

Для кожнай літары варта падабраць такі знак, каб усе разам яны склалі гарманічны дружны алфавіт, пры якім асобныя знакі лёгка і плаўна спалучаюцца адзін з адным, а пяро рухаецца па паперы рытмічна і хутка.

Менавіта такую задачу паставілі перад сабой супрацоўнікі курсаў стэнаграфіі пры факультэце грамадскіх прафесій універсітэта. У выніку шматгадовай работы і з'явілася рытмічная стэнаграфія. Тэорыя стэнаграфічнага пісьма спрасцілася ў некалькі разоў — скараціўся тэрмін навучання. Студэнты універсітэта, якія займаюцца на факультэце грамадскіх прафесій, затрачваюць на навучанне стэнаграфіі не два гады, як прынята, а толькі адзін вучэбны год.

Хочаце паспрабаваць? Мы чакаем вас на факультэце грамадскіх прафесій. Студэнты-першакурснікі яшчэ не ведаюць, дзе знаходзіцца ФГП? Гэта ж там, дзе падрыхтоўчыя курсы, толькі на адзін паверх вышэй (вул. Бабруйская, 9, п. 61).

В. ДЗЯНІСАЎ.

ДЗЕЙНІЧАЕМ

# Кожнай асобе — сацыяльную абарону!

**Гэты час чакаем з хваляваннем: прынясе пераход на рыначныя адносіны нешта станоўчае ці, наадварот, зробіць жыццё звычайнага чалавека яшчэ больш складаным? І як быць не толькі малазабяспечаным студэнтам, але і работнікам народнай адукацыі, чые фінансавыя справы не такія ўжо і выдатныя?**

**Калектыў нашага універсітэта распрацаваў шэраг прапаноў, накіраваных на забеспячэнне дадатковых гарантый сацыяльнай абароненасці і паляпшэнне ўмоў жыцця ветэранаў вайны і працы, інвалідаў і сем'яў, якія страцілі кармільцу, і накіраваў іх у Рэспубліканскі вучэбна-метадычны кабінет Міністэрства народнай адукацыі БССР:**

**— Штогод для асоб, якія страцілі кармільцу і вучацца ў ВНУ, тэхнікумах з адрывам ад вытворчасці, аказваць матэрыяльную дапамогу памерам 200 рублёў для палепшанага харчавання ці набыцця неабходных рэчаў.**

**— Выдзяляць неабходную колькасць пуцёвак у дамы адпачынку, санаторыі для студэнтаў — дзяцей-сірот і воінаў-інтэрнацыяналістаў у вольны ад вучобы час (у перыяд зімовых і летніх канікулаў).**

**— Аказваць штогод асобам, якія набылі пры выкананні службовых абавязкаў працоўныя калецтвы і перайшлі на пенсію па інваліднасці, непрацаздольным матэрыяльную дапамогу ў памеры месячнага аклада па пасадзе, якую яны займалі да няшчаснага выпадку.**

**— Пры афармленні на пенсію ветэрана вайны і працы выплачваць аднаразовую дапамогу ў памеры 500 рублёў.**

**— Зацвердзіць надбаўкі да пенсіі асобам, якія прапрацавалі ў сістэме народнай адукацыі не менш дваццаці (жанчыны) і дваццаці пяці гадоў (мужчыны) у памеры 20 працэнтаў налічанай пенсіі (з часу ўвядзення новага Закона аб пенсіях).**

**— Аказваць дапамогу ў паляпшэнні жыллёвых умоў ветэранаў вайны і працы, якія маюць у гэтым патрэбу.**

**— Павялічыць працягласць штогадовага аплачваемага адпачынку працуючым пенсіянерам (для гаспадарча-абслугоўваючага персаналу сістэмы народнай адукацыі) да 24 рабочых дзён.**

ХУТКУЮ ДАПАМОГУ!

# Расплата за бясплатнасць

**Мы вучымся лічыць. Калі раней, каб сэканоміць час, дамагаліся: «кожнаму работніку рэдакцыі — па дыктафону», то цяпер не прамінем дадаць: «...і мікракалькулятару». Скнарамі нас не назавеш — проста гаспадарлівыя. І, як звычайны гаспадар, перш за ўсё клапоцімся пра парадак у сваім доме. Вось і надумалі мы, што пераход на рыначныя адносіны павінен быць прывабным для ўсіх удзельнікаў вытворчасці. Не выключэнне і тыя, хто рыхтуе спецыялістаў.**

**Студэнт і рынак: як выжыць? Тэма сённяшняй размовы. Давайце ж глядзець шырэй: ВНУ на самазабеспячэнні — бязглуздзіца?**




Колькі яго ні ўгаворвалі, мой малодшы брат ад паступлення ў ВНУ адмовіўся. На мяне з надзеяй пазіралі бацькі: пераканай. А я сама пераканалася — не такі ўжо ён гультай і баязлівец. Проста больш разважлівы за мяне і больш начытаны за сваіх аднагодкаў.

— Калі зыходзіць з пазіцый разумнага сэнсу...— пачынае ён.

Міф пра бясплатнае навучанне прывучае да сціпласці. Адзін камп'ютэр на дзвесце чалавек? Дзякуй. Адно койка-месца на ўсю студэнцкую групу? Прыміце нашы віншаванні. Пасрэдныя веды, атрыманыя ў руінах, што былі калісьці карпусамі? А мы, прызнацца, і не разлічвалі на выжыванне жорсткага стымулу — калі спецыяліст дрэнна адукаваны, ён не атрымае добрага месца: цікавай работы, высокай зарплаты.

Нашто мне гэта зачараванае кола, дзе прыярытэт вышэйшай адукацыі прызнаны толькі на словах, а за аднолькавымі дыпломамі хаваюцца зусім розныя спецыялісты? Яны ж, заўваж, пасля прыняцця палажэння аб правах прадпрыемства, бясспрэчна, асуджаны на беспрацоўе. «Размеркаваных» інжынераў ужо не на кожным прадпрыемстве бяруць — аддаюць перавагу магчымасці павялічыць заработную плату за кошт скарачэння штатаў.

А шматлікія анекдоты пра самага жабрацкага прадстаўніка самай немаёмай у краіне ўзроставай катэгорыі? Яны не ўзнікаюць без падстаў. 73 працэнты бацькоў затрачваюць на дзяцей-студэнтаў у сярэднім 690 рублёў у год. Улічваючы працэнт інфляцыі, які пастаянна расце (з 1981 да 1989 года, па самых сціплых падліках, складае 45 працэнтаў), а таксама ўсеаб'ёмны таварны голад, што падкрадаецца сёння і да прадуктаў харчавання, спадзявацца на павелічэнне пакупной здольнасці студэнцкага кашалька не даводзіцца. Будатрады і падработка грузчыкам дадаюць штомесячна ў сярэднім 50 рублёў, што наўрад ці ўраўнаважыць хісткі бюджэт.

Так што студэнты, і ўвогуле вышэйшая школа, жывуць не па сродках. Не хапае інтэрнатаў, вучэбных плошчаў, матэрыяльна-тэхнічных сродкаў. І «калі зыходзіць з пазіцый разумнага сэнсу», з боку адміністрацый ВНУ прыём трэба скараціць на 20—30 працэнтаў, а студэнты «перабудоўваюцца» стыхійна — па прагнозах сектара моладзі Інстытута сацыялогіі АН СССР, у хуткім часе пяцімільённая армія савецкага студэнцтва скароціцца ў некалькі разоў.

Як ні сумна, але гэта яшчэ больш знізіць культурны патэнцыял нацыі.

М. СТАТКЕВІЧ.

БЮРО ПА ПРАЦАЎЛАДКАВАННЮ

# Па чым фунт плітак?

**Міхаіл Васільевіч КРАЎЦОЎ, начальнік аддзела кадраў аб'яднання «Мінскбудматэрыялы», не чакаючы, пакуль студэнты адчуюць пустату сваіх кашалькоў і скуднасць бацькоўскіх датацый, сам выходзіць з прапановай аб дзелавым супрацоўніцтве:**

— А што? Нават першакурснікам пад сілу. У нас на прадпрыемстве наладжаны выпуск керамічных і абліцовачных плітак усіх відаў, цэглы, будаўнічай керамікі, уцяпляльных матэрыялаў. Студэнты, ды і ўвогуле моладзь, у аб'яднанні кадры прывілеяваныя — працуюць толькі на механізаваных працэсах. Кантралёрамі-прыёмшчыкамі (правяраюць, сартыруюць і ўкладваюць плітку) ці прэсаўшчыкамі. Зарплату атрымліваюць за фактычна выкананы аб'ём работ — калі дзвесце з «хвосцікам», калі нават трыста. І змену кожны мае права падабраць у адпаведнасці з занятасцю: з 8 да 16 або з 16 да 22. **Пры наяўнасці сярод аднакурснікаў надзейнага зменшчыка магчымы варыянт з няпоўным працоўным днём. Няхай не пужае вас неразрыўнасць вузаў супрацоўніцтва: на час сесіі дагавор можна расторгнуць.**

**Так што, калі здаецца вам цесным бацькоўскі карак, хутчэй за даведкай у дэканат, прыхапіўшы пашпарт, і да нас. Звяртайцеся на адрас:** ***вул. Сярова, 2, аб'яднанне «Мінскбудматэрыялы», аддзел кадраў. Праезд аўтобусамі №№ 12, 45, 73 і тралейбусамі №№ 43, 59.***

Па чым фунт плітак? Праверце самі.

## Даведачна-бібліяграфічны аддзел бібліятэкі

*(2-гі паверх, галоўны корпус). З 1 верасня ўзнаўляе тут работу выстаўка новых паступленняў літаратуры, якая працуе па панядзелках, аўторках і серадах з 10 да 17 гадзін.*

*Выстаўка прапагандуе кнігі і інфармацыйныя матэрыялы, што паступілі ў фонд бібліятэкі за тыдзень.*

*Чытачы, якія наведаюць выстаўку, маюць магчымасць атрымаць літаратуру па заяўках на працягу тыдня пасля замены экспазіцыі.*

*ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ! ЗАПРАШАЕМ ВАС РЭГУЛЯРНА НАВЕДВАЦЬ НАШУ ВЫСТАЎКУ!*

ПАДЛІЧЫМ?

# КОШТ СПАЖЫВЕЦКАЙ КАРЗІНЫ

Спажывецкая карзіна — гэта мінімум прадуктаў харчавання, адзежы, абутку, бялізны, культтавараў, прадметаў санітарыі і гігіены, лекаў, выдаткаў на культурна-асветніцкія мерапрыемствы, жыллё, бытавыя і камунальныя паслугі, транспарт, адпачынак, другія сацыяльныя патрэбы чалавека.

У новых умовах спажывецкая карзіна тавараў і паслуг зрабілася значна даражэйшай і каштуе 80 рублёў. І ўсё ж мінімум сродкаў, неабходных для нармальнага існавання аднаго чалавека, вылічваецца па-рознаму. Паводле падлікаў Дзяржкампрацы — штомесячны даход у 84 рублі, ВЦСПС вызначае гэту суму ў 97 рублёў, Дзяржкамстат — 80 рублёў.

Пры кошту карзіны 80 рублёў адпаведнай будзе мінімальная зарплата, мінімальная пенсія, грашовая даплата па догляду за дзіцем ва ўзросце да 1,5 года.

Пакуль што гэтыя разлікі папярэднія, а рыса беднасці па-ранейшаму 75 рублёў. 11 працэнтаў насельніцтва краіны працягваюць існаваць за гэтай рысай. А студэнты (з тых, што не ў стане стаць у наступным годзе выдатнікамі) застануцца за ёй і потым. Бачыце як!

ЗАПРАШАЛЬНЫ БІЛЕТ

***МАЛАДЗЁЖНАЯ ГАСРАЗЛІКОВАЯ ФІРМА «СЕРВІС УНІВЕРСУМ»***

*аб'яўляе конкурс на распрацоўку фірменных знака і стыля МГФ «Сервіс Універсум».*

*Устаноўлена ўзнагароджанне для пераможцы конкурса памерам 500 (пяцьсот) рублёў.*

*Тэрмін падачы работ на конкурс — да 20 верасня 1990 года.*

*Жадаючыя азнаёміцца з палажэннем аб конкурсе знойдуць яго ў 306-м ПАКОІ ГАЛОЎНАГА КОРПУСА УНІВЕРСІТЭТА. ЗВЯРТАЦЦА ДА Аксаны ЗЫБІНАЙ. Даведкі ПА ТЭЛЕФОНЕ 20-66-85.*

РЭКЛАМА

РАСПРАЦОЎШЧЫКІ ПРАГРАМНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ ДЛЯ ПЕРСАНАЛЬНЫХ КАМП'ЮТЭРАЎ!

МЫ ЗНОЙДЗЕМ ВЫГАДНЫХ ПАКУПНІКОЎ ДЛЯ ВАШЫХ РАСПРАЦОВАК

ФОНД АЛГАРЫТМАЎ І ПРАГРАМ МІНСКАГА ФІЛІЯЛА САВЕЦКА-АМЕРЫКАНСКАГА СУМЕСНАГА ПРАДПРЫЕМСТВА «ДЫЯЛОГ» МАЕ ШЫРОКІЯ МАГЧЫМАСЦІ Ў АРГАНІЗАЦЫІ ВЫХАДУ НА ЎНУТРАНЫ І СУСВЕТНЫ РЫНАК ПРАГРАМНЫХ ПРАДУКТАЎ:

— камерцыйную сетку з прадстаўніцтвамі больш чым у 40 гарадах СССР;
— высокакваліфікаваных экспертаў і праграмістаў;
— камп'ютэры і сістэмы праграміравання.

ЗАПРАШАЕМ ДА СУПРАЦОЎНІЦТВА АРГАНІЗАЦЫІ, ГРУПЫ І АСОБНЫХ РАСПРАЦОЎШЧЫКАЎ.

Прымаюцца прапановы практычна па любой сферы дзейнасці — ад гульняў да самых складаных сістэм аўтаматызацыі інжынернай і навуковай працы.

ГАНАРАР СКЛАДАЕ ДА 50 ПРАЦЭНТАЎ ПРАДАЖНАГА КОШТУ!

Найбольш перспектыўныя распрацоўкі наша тэхналагічная служба пры неабходнасці даводзіць да стану праграмнага прадукта, які адпавядае сусветным стандартам. Ім прысвойваецца сертыфікат якасці і арганізуецца шырокая рэклама.

Не ўпусціце шанц:

ВАШЫ РАСПРАЦОЎКІ ПРЫНЯСУЦЬ ВАМ УДАЧУ!

СП «Дыялог», Мінскі філіял.
БССР, Мінск, 220002, Старавіленскі тракт, 41.
Тэлефон 378-326, тэлефакс 377-941.

*Рэкламная фірма «БЕЛОР».*

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.

30 жніўня
Зак. 2020.
Т. 2000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75. ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар М. Г. ЗАГОРСКАЯ.